денты указали, что значимыми в их семьях будет общение с бабушками и дедушками, совместные семейные праздники, обязательные завтраки и ужины всей семьей, ежедневное общение в семейном кругу.

Следовательно, все студенты нацелены на создание полной семьи с ребенком / детьми, на межпоколенческое общение, на равноправие супругов в вопросах быта, социализации и воспитания детей, на гармоничные взаимоотношения как внутри семьи, так и с прародителями.

В рамках интерактивной деятельности студенты готовили методическую копилку (не менее пяти воспитательных мероприятий, направленных на работу с родителями и детьми, на гармонизацию семейного воспитания), характеризовали стили воспитания, классифицировали воспитательные методы. На занятиях студенты защищали свою точку зрения, аргументируя и подкрепляя конкретными примерами, проводили воспитательные мероприятия в учебных группах, среди других групп студентов факультета социальной педагогики и психологии, осуществляли рефлексию. С помощью метода педагогического наблюдения нами была отмечена активность и инициативность в рамках интерактивной работы на учебных занятиях, заинтересованность темами и вопросами преподаваемой учебной дисциплины, обсуждаемыми практическими проблемами. Зачастую через дискуссию осуществлялся поиск оптимальных средств, методов воспитательного воздействия либо решения семейной проблемы. Студенты неоднократно высказывали одобрение относительно выбора учебных заданий и проведения учебных занятий.

**Заключение.** Таким образом, учебная дисциплина «Педагогика семьи» имеет достаточный потенциал для формирования образа традиционной семьи у студентов, что отражается не только в тематике и проблематике, связи учебной дисциплины с этнопедагогическими знаниями и опытом, но и в интерактивном характере учебной дисциплины, практической проработке студентами учебного материала через воспитательные мероприятия, сравнение средств, методов и форм воспитания в семье, что продемонстрировали результаты эссе.

## ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНЫХ НАВЫКАЎ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ "КАНСУЛЬТАВАННЕ Ў САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ"

*С.І. Міхайлаў*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Камунікатыўныя навыкі з'яўляюцца неад'емным складнікам прафесійнай падрыхтоўкі педагога сацыяльнага, якому па роду сваёй дзейнасці даводзіцца пастаянна камунікаваць з навучэнцамі, іх бацькамі, педагогамі, вырашаючы разнастайныя сацыяльна-педагагічныя задачы [1]. Вучэбная дысцыпліна "Кансультаванне ў сацыяльна-педагагічнай дзейнасці", якая чытаецца для студэнтаў спецыяльнасці "Сацыяльная педагогіка", акрамя тэарэтычных аспектаў, скіравана таксама на выпрацоўку ў студэнтаў разнастайных практычных навыкаў, у тым ліку камунікатыўных.

Спецыфіка кансультатыўнай дзейнасці педагога сацыяльнага прадугледжвае арганічнае спалучэнне асобасных і прафесійных якасцей. Сярод асобасных якасцей эфектыўнага кансультанта традыцыйна вылучаюць патрабаванні да псіхічных працэсаў і стану (памяць, мысленне, успрыманне, увага), эмацыйных і валявых характарыстык (настойлівасць, паслядоўнасць, стрыманасць), элементаў самапазнання і самарэгулявання (самакрытычнасць, самаацэнка), індывідуальных рыс (красамоўства,

эмпатычнасць, візуальнасць). Сярод прафесійных якасцей паспяховага кансультанта, як правіла, вылучаюць кагнітыўныя навыкі (уменне аналізаваць і ацэньваць вопыт, як свой, так і іншых, прымяняць на практыцы свае веды, разумець праблемы іншых людзей), канструктыўныя навыкі (уменне дзейнічаць у алгарытме выпрацоўкі рашэння, супрацоўнічаць з іншымі ўстановамі і ведамствамі ў працэсе вырашэння праблем кліента), арганізатарскія навыкі (уменне арганізаваць, планаваць і кантраляваць работу), камунікатыўныя навыкі (уменне хутка наладжваць кантакт з іншымі людзьмі, арганізоўваць зносіны і кіраваць імі, валодаць прыёмамі вядзення гутаркі, дыскусіі, дыялогу, ведаць моўны этыкет, пры дапамозе слова карэктаваць паводзіны кліента, валодаць тэхнікай мовы, рытарычнымі прыёмамі, умець аргументаваць і абгрунтаваць сваю думку, пераканаць іншага чалавека і інш.) [2].

Мэта нашага даследавання – прааналізаваць прыёмы фарміравання камунікатыўных навыкаў і распрацаваць эфектыўную сістэму практычных заданняў, скіраваных на выпрацоўку ўстойлівых камунікатыўных навыкаў у студэнтаў у працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны “Кансультаванне ў сацыяльна-педагагічнай дзейнасці”.

**Матэрыял і метады.** Шляхам прымянення тэарэтычных (аналіз, абагульненне, сінтэз, параўнанне) і эмпірычных метадаў (назіранне, гутарка, інтэрв’ю, тэставанне, мадэляванне сацыяльна-педагагічных сітуацый) намі вырашалася задача па ацэнцы ўзроўню сфармаванасці камунікатыўных навыкаў у 21 студэнта 3 курса спецыяльнасці “Сацыяльная педагогіка” дзённай формы атрымання адукацыі факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі. Ацэнка праводзілася на 2-х этапах: на пачатку семестра і па завяршэнні лекцыйных і практычных заняткаў па вучэбнай дысцыпліне “Кансультаванне ў сацыяльна-педагагічнай дзейнасці”. Акрамя таго, намі ставілася задача распрацоўкі найбольш эфектыўных тэхнік і прыёмаў сацыяльна-педагагічнага кансультавання, якія б спрыялі фарміраванню і развіццю ў студэнтаў камунікатыўных навыкаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На папярэднім этапе намі была распрацавана сістэма паказчыкаў (індыкатараў), пры дапамозе якіх ацэньваўся ўзровень сфармаванасці ў студэнтаў камунікатыўных навыкаў. Да ліку такіх індыкатараў адносіліся: глыбіня і разгорнутасць адказаў студэнтаў на пастаўленыя пытанні, у тым ліку адсутнасць няпоўных або звышсціслых, кароткіх адказаў; мінімізацыя дыхатамічных адказаў у стылі “так-не”; уменне весці дыялог ва ўмовах пераканаўчага адстойвання асабістай пазіцыі суразмоўнікам; аргументаванасць і абгрунтаванасць уласнай пазіцыі ў дыспуце; чысціня, дакладнасць, вобразнасць маўлення; уменне лагічна фармуляваць і задаваць удакладняючыя пытанні; разнастайнасць лексічных сродкаў і сінтаксічных канструкцый, выкарыстаных студэнтам у працэсе адказу, дыялогу, дыспуту; уменне ўтрымліваць увагу аўдыторыі і падтрымліваць з ёй кантакт; валоданне яскравымі і выразнымі невербальнымі сродкамі камунікацыі і іншыя.

Аналіз згаданых вышэй індыкатараў на першым этапе даследавання (на пачатку семестра і вывучэння дысцыпліны) паказаў, што толькі 24% студэнтаў фокуснай групы валодаюць высокім узроўнем сфармаванасці камунікатыўных навыкаў, неабходных для правядзення сацыяльна-педагагічных кансультацый. Астатнія характарызаваліся або сярэднім узроўнем (57%), або нізкім (19%). З мэтай развіцця практычных навыкаў кансультавання студэнтам на занятках прапаноўваліся разнастайныя заданні на развіццё вуснай і пісьмовай камунікацыі. Такія навыкі пачалі адпрацоўвацца ўжо ў працэсе працы з навуковай тэрміналогіяй, калі студэнтам неабходна было запісаць і агучыць свае ўласныя фармулёўкі некаторых сацыяльна-педагагічных паняццяў і тэрмінаў, напрыклад, даць сваю дэфініцыю паняццю “сацыяльна-педагагічнае кансультаванне”. Такая, здавалася б, элементарная лагічная аперацыя дазваляе студэнту не проста надаць строга фіксаваны сэнс выразу, але і вылучыць адрозныя рысы відавага паняцця, падабраць уласны набор лексіка-апісальных сродкаў для яго азначэння. Наступнае параўнанне і

аналіз шматлікіх “аўтарскіх” дэфініцый, іх супастаўленне з азначэннямі, дадзенымі ў манаграфіях і навуковых артыкулах, у сваю чаргу, дазваляюць абмеркаваць са студэнтамі працэсуальны характар сацыяльна-педагагічнага кансультавання, яго суб’ектна-аб’ектны бок, пералічыць сацыяльна-педагагічныя праблемы, што патэнцыйна могуць стаць аб’ектам дадзенага віда кансультавання.

Важным элементам фарміравання камунікатыўных навыкаў будучых кансультантаў таксама выступае засваенне студэнтамі асобных тэхнік (мікратэхнік) кансультавання. У прыватнасці, на практычных занятках студэнты, выкарыстоўваючы тэхніку адлюстравання пачуццяў, вучацца аналізаваць і распазнаваць эмацыйныя перажыванні суразмоўцы, у тым ліку з дапамогай пытанняў накшталт: “А што вы адчулі, калі...?”, “А як вы насамрэч адносіцеся да...?” і падобных. Заданні на выкарыстанне тэхнік канкрэтызацыі і перафразіравання вымушаюць студэнтаў падчас мадэлявання кансультацыі ўжываць разнастайныя ўдакладняльныя і паглыбляючыя фармулёўкі пытанняў тыпу: “А як вы адчувалі сваю разгубленасць?”, “Вы адчувалі сябе разгубленым, гэта значыць, у вас узнікла пачуццё, што вы не разумееце, што адбываецца?”, “Растлумачце, калі ласка, яшчэ раз...”, “Калі я правільна зразумеў, вы кажаце...”, “Іншымі словамі, вы думаеце, што...” і іншыя. На практычных занятках па сацыяльна-педагагічным кансультаванні студэнты вучацца задаваць пытанні, патрабуючыя разгорнутых адказаў ад суразмоўцы (напрыклад, замест пытання “Вам падабаецца вучоба?” лепш задаць пытанне “Што вам больш за ўсё падабаецца ў вучобе?”), выкарыстоўваюць мікратэхнікі кансультавання, накіраваныя на падтрыманне дыялогу з кліентам шляхам “мінімальных” сродкаў зносін (напрыклад, своечасовае ўжыванне ў размове выказванняў тыпу: “Я разумею”, “Працягвайце, гэта цікава”, “Раскажыце падрабязней”), удзельнічаюць у мадэляванні і вербальным прайграванні сацыяльна-педагагічных сітуацый, працуючы ў парах і кансультуючы ўмоўных навучэнцаў, іх бацькоў, педагогаў (напрыклад, дзяўчынка 11 гадоў скрала дома грошы і набыла пачастункі ўсяму класу; маці не ведае, як паўплываць на 12-гадовага сына, які не мае матывацыі да вучобы; дзяўчынка 14 гадоў лічыць, што яна непрыгожая, і праз гэта камплексуе, што на яе ніхто не звяртае ўвагі і падобнае). Заданні падобнага кшталту развіваюць не толькі вербальныя навыкі студэнтаў, але і патрабуюць ад іх у працэсе правядзення кансультацыі ўмелага задзейнічання невербальных і гукавых сродкаў камунікацыі – адпаведнага выразу твару, позы цела, кантакту вачэй, паўз, жэстаў, інтанацыі.

У кансультацыйнай дзейнасці педагога сацыяльнага таксама надзвычай важна ўмець пабудаваць камунікацыю з суразмоўнікам такім чынам, каб прапанаваныя рэкамендацыі, рэабілітацыйныя меры або сацыяльна-педагагічныя парады ўспрымаліся кліентам пераканаўча і адназначна, выклікалі шчыры давер, не дапускалі жорсткага непрымання і сумневу ў іх правільнасці і неабходнасці. Для гэтага важна ўмець лагічна і абгрунтавана сфармуляваць свае думкі і данесці іх да кліента. Такому аргументаванаму падыходу да фармулявання сваіх парад і рэкамендацый спрыялі, напрыклад, практыкаванні, у якіх студэнтам неабходна было прывесці свае аргументы (спачатку “за”, а потым “супраць”) адносна пэўнага амбівалентнага палажэння (напрыклад, “Вышэйшая адукацыя з’яўляецца неабходным элементам паспяховай прафесійнай самарэалізацыі”). Камунікатыўныя навыкі студэнтаў развіваюцца і падчас выканання практыкаванняў, накіраваных на самапазнанне (тэма “Асоба кансультанта”). Гэта могуць быць заданні накшталт праектыўнай методыкі “Незакончаныя сказы”: “Я злуюся, калі хто-небудзь...”, “Найбольшы недавер да іншых у мяне выклікае...”, “Больш за ўсё я баюся...”, “Знаходжанне ў гэтай групе мне падабаецца тым, што...”, “Я не магу зразумець, чаму...” і падобныя. Па завяршэнні задання студэнты ў вуснай форме

характарызуюць сябе як асобу, вылучаючы ў тым ліку неабходныя і, наадварот, непажаданыя якасці для кансультанта і педагога сацыяльнага ў цэлым.

Фарміраванню атмасферы даверу, адкрытасці, добразычлівасці, разняволенасці ва ўзаемаадносінах кансультанта і кліента спрыяе такая асаблівасць камунікатыўнай культуры, як метафарычнасць, вобразнасць, трапнасць і дасціпнасць маўлення кансультанта. З гэтай мэтай студэнты падбіраюць і выкарыстоўваюць афарызмы, інтэгруючы іх у тэкст кансультацыйнага працэсу, тлумачаць, якія ўстаноўкі кансультанта ў адносінах праблем кліентаў адлюстроўваюць ужытыя імі афарызмы (напрыклад, "Людзі пераадольваюць свае цяжкасці пры дапамозе здаровага сэнсу", А.Адлер; "Кожная праблема прыносіць з сабой дар, які можа ўзбагаціць жыццё", А.Джэксан), даюць метафарычнае апісанне некаторых паняццяў, што выкарыстоўваюцца ў сацыяльна-педагагічным і псіхалагічным кансультаванні: ідэнтычнасць (прыклады студэнтаў: бясконцая кропка, дно акіяна, кроплі дажджу), воля (вецер, што падганяе караблі, дамба на бурнай рацэ), кліент (птушка ў клетцы з ключом на шыі) і г.д.

**Заключэнне.** Мэтанакіраваная праца па развіцці камунікатыўных навыкаў студэнтаў у працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны "Кансультаванне ў сацыяльна-педагагічнай дзейнасці" прывяла да пэўных зрухаў у вызначэнні ўзроўню сфармаванасці камунікатыўных навыкаў асобных студэнтаў. На выніковым этапе даследавання (напрыканцы семестра) больш за 90% студэнтаў рэпрэзентатыўнай групы мелі высокі (38%) або сярэдні (53%) узровень сфармаванасці камунікатыўных навыкаў.

1. Савицкая, Т. В. Проектная деятельность в системе профессиональной подготовки студентов – будущих специалистов по социальной работе / Т. В. Савицкая, Т. Д. Вакушенко, С. Д. Матюшкова // Социально-психологические проблемы современного общества: пути решения (памяти профессора А. П. Орловой) : сб. науч. ст.. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – С. 327-333. – Режим доступа: https://rep.vsu.by/handle/123456789/34387 (дата доступа: 26.01.2025).

2. Орлова, А.П., Михайлова, Е.Л. Потенциальные возможности моделирования индивидуальной траектории профессионального становления будущего специалиста социальной сферы / А.П. Орлова, Е.Л. Михайлова // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2012. – № 1 (67). – С. 110-115. – Режим доступа: https://rep.vsu.by/handle/123456789/4242 (дата доступа: 26.01.2025)

## ФОРМИРОВАНИЕ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ ПОСРЕДСТВОМ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ ALMA MATER

*Т.В. Савицкая*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Воспитательная работа, осуществляемая учреждениями высшего образования, направлена на формирование у студентов качеств, необходимых члену государства и современного общества (гражданственности, патриотизма, трудолюбия, ответственности, доброты, честности, активной жизненной позиции), т.е. на воспитание личности высокообразованной, с высоким уровнем культуры, что невозможно без формирования национального самосознания [1]. Формирование национального самосознания студентов происходит как во время процесса обучения – при изучении учебных дисциплин, так и в ходе участия молодежи в воспитательных мероприятиях республиканского, областного и местного уровней (фестивали, конкурсы, дискуссии, диспуты, дебаты гражданско-патриотической, творческой, этнопедагогической направленности) [2]. Значимым ресурсом в осуществлении работы по формированию национального самосознания является изучение студентами истории своего вуза, являющегося культурно-образовательным центром региона и отражающим в собственном развитии основные исторические вехи развития государства [3]. Вышеизложенное обусловило цель исследования: проанализировать роль изучении истории ALMA MATER в деятельности